# БУДЗЬ З НАМІ Ў РОДНЫМ КРАІ



Выпуск № 4(10)

*Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў*

*III чвэрць даволі працяглая і менавіта таму складаная. І каб вучоба была на радасць усім, давайце разам рабіць яе больш цікавай. Таму прапануйце свае ідэі наконт таго, якія мерапрыемствы і конкурсы праводзіць, каб вам было цікава. Нас, вядома, чакаюць традыцыйныя мерапрыемствы: Дзень закаханых, 23 лютага і 8 Сакавіка.* ***А чаго хочацца вам?*** *Прапануйце свае ідэі і будзем рэалізоўваць іх разам.*













# ВЫНІКІ ІІ ЧВЭРЦІ

Вось і пачалася ІІІ чвэрць, але хацелася б звярнуць увагу на вынікі папярэдняй. На працягу ўсёй чвэрці вучні разам з настаўнікамі шмат працавалі. У кагосьці вынікі лепшыя, а ў каго і горшыя. Нягледзячы ні на што мінулая чвэрць была напоўнена мерапрыемствамі, конкурсамі (як вучэбнымі, так і выхаваўчымі).

По выніках ІІ чвэрці ў нашай школе 3 **выдатнікі**.

| | | |
|---|---|---|
| <br>**Крывеня Мілана,<br>IV клас** | <br>**Барташэвіч Данііл,<br>IV клас** | <br>**Квітун Аляксандра,<br>V клас** |

**Нашы надзеі**

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| <br>**Грынцэвіч<br>Аляксандра,<br>III клас** | <br>**Гаўрылюк<br>Алёна,<br>V клас** | <br>**Скерсь<br>Святлана,<br>V клас** | <br>**Копаць<br>Ганна,<br>VI клас** | <br>**Мамедава<br>Рэната,<br>VII клас** |
| <br>**Наваграц<br>Таццяна,<br>VIII клас** | <br>**Гаўрылюк<br>Анастасія,<br>VIII клас** | <br>**Боднар<br>Ганна,<br>IX клас** | <br>**Навасад<br>Яўгенія,<br>IX клас** | <br>**Гур’ян<br>Анастасія,<br>X клас** |

# НОВЫ ГОД




Новы год – гэта цудоўная пара… Кожны чалавек, дарослы і малы, верыць, што адбудзецца нешта цікавае, чароўнае. Гэта пара, калі усе загадваюць жаданні і вераць, што яны спраўдзяцца. Усе чакаюць навагодніх святаў і рыхтуюцца да іх прыходу загадзя і вельмі старанна. Наша школа не выключэнне.



Вучні разам з настаўнікамі пачалі работу па падрыхтоўцы да свята Новага года яшчэ ў канцы лістапада. Было шмат ідэй, якія неабходна было рэалізаваць. Напярэдадні свята быў аб’яўлены агульнашкольны конкурс на лепшую ёлку. Удзел у конкурсе прынялі ўсе класы, а вучні II класа ў поўным складзе.

Кульмінацыяй сталі мерапрыемствы, прысвечаныя гэтаму чароўнаму святу, якія былі арганізаваны для трох катэгорый вучняў: I-IV клас, V-VII клас і VIII-X класы.











Усё прыемнае, як заўсёды, хутка канчаецца. Так і навагоднія святы прайшлі. Але мы не будзем хваляваццa, бо ведаем, што будзе яшчэ шмат цудоўных, цікавых і доўгачаканых святаў, да якіх мы будзем рыхтавацца і святкаваць разам.

# КОНКУРСЫ

## Раённы конкурс VI абласнога фэсту-конкурсу юных мадэльераў і дызайнераў «ЖЫВІЦА»

I. Праходзіць раённы завочны конкурс юных майстроў. Тэма "Вялікдзень". На конкурс прымаюцца работы аб'ёмныя і плоскасцевыя працы, выкананыя ў рознай тэхніцы дэкаратыўна-прыкладнай творчасці: саломка, лаза, кераміка, ткацтва, размалёўка па дрэве, скура, папяровая пластыка і г.д. у намінацыях: "Сюжэтная кампазіцыя", "Сувенір-падарунак". Конкурсныя працы і заяўкі падаюцца ў Лідскі РЦТДзіМ (каб. 115, 116) да 17 лютага 2017 года.

II. Завочны конкурс юных дызайнераў

Конкурс мяркуе выраб знака фэсту "Жывіца" ў любой тэхніцы. Конкурсныя працы прымаюцца да 17 лютага 2017 года, лепшыя з якіх будуць экспанавацца на выставе "Велікодныя цуды" ва ўстанове адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны абласны Палац творчасці дзяцей і моладзі".

Крытэрыі адзнакі вырабаў:

- аўтарства і арыгінальнасць;
- тэхнічнае майстэрства;
- мастацкая выразнасць;
- якасць і акуратнасць выканання.

## Вынікі агульнашкольнага конкурсу "Лепшы клас года" за I паўгоддзе 2016/2017 навучальнага года

**1 месца – IV клас (179 балаў)**
**2 месца – X клас (164 балы)**
**3 месца – V клас (153 балы)**
4 месца –VIII клас (139 балаў)
5 месца –VI клас (131 бал)
6 месца – IX клас (109 балаў)
7 месца – III клас (98 балаў)
8 месца –VII клас (88 балаў)
9 месца – II клас (86 балаў)
10 месца – I клас (49 балаў)

## Не спыняйцеся на дасягнутым


| | | | |
|---|---|---|---|
| **Будзь з намі ў родным краі** *Газета для вучняў, настаўнікаў і бацькоў* | **Заснавальнік –** Мінойтаўская СШ **Галоўны рэдактар –** Хіневіч Н.М. | **Афармленне:** Савет старшакласнікаў | **Адрас рэдакцыі:** в.Мінойты, вул.Чырвонаармейская, 3, тэл. 597337 |